Источник: **«Звязда» - 2013-06-07**

## Гісторыя народаў і Царквы: ад Хрышчэння да нашых дзён

Учора ў Мінску стартавала Міжнародная навуковая канферэнцыя "Хрышчэнне Русі ў лёсах Беларусі, Расіі і Украіны: выбар цывілізацыйнага шляху". Гасцей двухдзённага форуму гасцінна прыняла канферэнц-зала Нацыянальнай акадэміі навук. У працы канферэнцыі ўдзельнічалі каля пяцісот прадстаўнікоў акадэмічнай, універсітэцкай навукі і грамадскасці Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, а таксама тэолагі, прадстаўнікі Рускай Праваслаўнай Царквы, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, журналісты.

Адкрыў мерапрыемства намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатоль Тозік, які ўзначальвае рэспубліканскі арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і святкаванні 1025-годдзя Хрышчэння Русі. У канферэнц-зале НАН Беларусі прагучалі ўрачыстыя словы вітанняў да прысутных ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі; Мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Украіны Уладзіміра, намесніка Старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі акадэміка Уладзіміра Гусакова, пасла Расіі ў Беларусі Аляксандра Сурыкава.

7 чэрвеня праца форуму працягнецца на секцыйных пасяджэннях. Сярод праблем, якія абмяркоўваюцца, — роля праваслаўных прынцыпаў выхавання ў духоўна-маральным развіцці асобы, узаемадзеянне нацыянальнай, грамадзянскай і рэлігійнай ідэнтычнасці грамадзян, дзяржаўная палітыка ў дачыненні да рэлігійных арганізацый у Рэспубліцы Беларусь, уплыў царквы на палітычную культуру грамадства і іншыя.

На пленарным пасяджэнні і секцыях будзе заслухана каля 150 навуковых дакладаў. Пасяджэнні секцый пройдуць у Прэзідыуме Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінскай гарадской ратушы, сталічным Доме міласэрнасці.

**Уладзімір АЛЯКСАНДРАЎ.**